БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрас рэдакцыі і адміністрацыі: Сэрпухоуская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 до 2 гадз. пасьля поулня. Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.

Рэдакцыя пакідае за сабой права паправляць перасыланые рукапісы і карэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Падпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак: за верш пэтыту на 1-й стран. 1 ру[illegible] на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 51. Менск. Нядзеля 26 мая 1918 г. Год I

Абвестка.

Мэдыцынскі Аддзел Местовай Управы запрашае дохтара зеля кіравання Мэдыцынскім бюро, каторы павінен мець оугую практыку, як знаток анітарыі і гігіены, а так сама як вопытны рукавадзіцель зела Грамадзянскай Мэдыцыны.

Дыбенкіада.

Цікавае з'явішчо уяўлялі з сябе пасядзэння маскоўскаго рэвалюцыйнаго трыбуналу, які разглядаў справу быўшаго «главкофлота» Дыбенко.

Нізвычайны суд, нізвычайныя сьведкі, нізвычайныя пракуратары і адвакаты. Праглядаючы адчоты аб справе выносіш ўражэнне, што гэта дзеці састроіўшы міны сэр'ёзных людзей робюць гульню у «суд». Ведаеце,—як дзеці: «ты Пятрок ні так гаворыш, пратсядатаiь павінен казаць так:»..,
— «Што ты мяне вучыш? Я і сам знаю, як на судзе робіцца, я бачыў сам».

— «Ну то я ні буду гуляць»...

— «І як сабе хочаш!»...

І так далей, і так далей. А гульня усё ж такі ні перастае і «суд» ідзе сваім чарадом.

Там—так сама:

Штэйнбэрг быўшы камісар юстыцыі жаліцца, што выданая ім інструкцыя для рэвалюцыйных судоў саўсім ні спаўняецца.—«У царскіх судох і то было лягчэй»—кажа ён і у канцы, пасьля доўгіх і частых спрэчак з маршалкам трыбуналу, заклікае да яго тварыслаго споўчуцця.

Маршалак аб'яўляе пастанову трыбуналу:

«Запрапанаваць абароне пакінуць параўнаня трыбуналу с царскім судом, і на. нітаварыскія стасункі ні спасылацца».

— «С табой гуляць нельга!»

— „Ну то і ні гуляй!»

Але тое на што хадзіла дзівіцца у рэвалюцыйны трыбунал ахвочая да сэнсацыяў мускоўская публічнасьць ні было дзяціпай гульнёй. Гэта судзілася рэвалюцыйная Расія.

— «А мяне ведаеце, цікавіць ваша біографія»—кажа «вінавайца» Дыбенко.

— «Мая біографія ішчэ на перадзі» прэ «пракуратар» Крыленко на хлусьлівае запытанне.

Крыленко абмыліўся: наперадзі у яго ужо німа біографіі. Уся яна асталася разглеџжаnай тутака, на гэтым «судзе Дыбенко», разам з біографіямі яго таварышаў па партыйнай і «дзержаўнай» рабоце, пачынаючы ад глаўнаго «наркомісара» Леніна і канчаючы тым матросам, каторага вывелі с публікі за неспакойнае утрыманне сябе у часе дапросу Дыбенкі.

Гэто—біографія усёй расійскай рэвалюцыі, ад «прыказу № 1» да цяперашніх радіо, разсыланых Ленінымь.

Дыбенко ні было за што судзіць. Гэто сымбол, а нірэяльныя рэчы ні павінны разглядацца кім бы то ні было.

«Чудо Усерасійскі — богатырь» матрос Дыбенко ўсерасійскі «адданы пролетарыяту, і рэвалюцыі», сьляпы надпольны крот, «інтэлігэнт» партыі Крыленко, ні падлегаюць ні царскаму ні рэспубліканскаму ні суду ні рэволюцыйнаму трыбуналу. Сучасьнікі могуць быць проціў іх, могуць змагацца з імі, а суд... падзеі ужо выносяць над імі свой суд, зганяючы іх усіх пад адзін дах і змушаючы тамака займацца ўзаемнай грызьней.

Бо хіба-ж гэто, пры усёй сэр'ёзнасьці прыбраных на сябе мінаў, суд, а ні грызьня, старая камітэтская, «таварыская» грызьня,—тое што рабілося у трыбунале.

Хіба Крыленко, навекі слаўны адгэтуль у гісторыі Маскоўшчыны «главковерх», той самы аб якім сьведкі казалі яму-ж у вочы, што ад яго: ваеннай сьвядомасьці—«як ад казла малака»,—хіба ён мог, меў моральнае, ці якое іншае право магчы выступаць яко прокуратор?

— «Чаму я павінен за яго нясьці атказ?»—пытаецца Дыбенко, протэстуючы проці далучэння дакумэнтаў аб некім Годлевскім, члене яго партызанскаго аддзелу, каторы ўчыняў рэстрэлы без суда.- Малакаго ён ні разстрэліваў? Тож і Духоніна забілі пры Крыленцэ. Ен-жа ні нясе адказу за гэтае забіўство?»

Так, Крыленко формальна ні станавіўся вінавайцаю на гэтым судзе. Наадварот, выступаючы пракуратарам ён скрупулятна стараўся давесьці перад судом, што Дыбенка вялікі праступнік. Усё знайшоў, усё успомніў, нічога ні абмінуў. І сьпірт, і нідбаласьць, ініўмеласьць, і разстрэлы нявінных людзей і шмат ішчэ чаго іншаго выцягваў на Божы сьвет «главковерх" з біографіі «главкофлота».

Але ніхай заспакоіцца нішчасны «главкофлот»:

Ні адзін ён атказываў на судзе. Разам з ім судзіліся усе яго быўшыя таварышы. Ен быў толькі адным пз роўнаправных артыстаў у гэтай камэдыі, на якую з рожнымі пучцирямі на працягу нескольківх дзён дзівавалася ні толькі Масква—сталіца і Масква-Вялікаросія,— дзівіўся увесь сьвет.

Тамака судзілася руская рэвалюцыя, пісалася біографія яе,—цёмнай, пьянай, разбэшчэнай нілітасьціва-зьверскай, ніспраўядлівай.

Судзіліся, кронштадскіе чудо-богатыри», судзіліся «идеологи революціи» ад с.-р. да... Бог яго ведае каго і асуджалася азіятчына, каторая прыбраўшыся у соцыялістычныя шаты вылезла на гару, калі гістърычныя падзеі паскраблі крышачку скуру «высокой русской культуры», панаваўшай у расійскай дзержаве.

—Судзіўся ні Дыбенко.

—Судзілася «Дыбенкіада».

А асуджалася азіятчына.

А. Новадворскі.

К. Кастравіцкі і Г. Татур.

«О Божэ, Спасе наш, з няволі вызволь нас, ты прауду нам пакаж»...

Я помню якое моцвае свяшчэннае уражэнне зрабіу на нас маладых хлопцау 15-17 гадоу таму назад першы беларускі верш прачытанны нам К. Кастравіцкім.

Мы былі маладымі хлопцамі-энтузіастамі. Ад барадатай прысадзістай фігуры аутара, насіушаго дэманстрацыйны кажух, боты і падпіразанаго «чорна-рускім» поясам, веяло, такой моцнай нісакрушымай як скала верай, што «Беларусь трэба падымаць».

Романтызм стараго «народнічэства», але беларускаго, меу сваім можэ едыным прэдстаунікам Кастравіцкаго. Тагды гэтых нудных палітычных праграм ішчэ ні было.

Самая дубовая Александроуская рэакцыя і сыстэма абрусецільства была у поуным расквіце. Адазвацца гімназісту, што ен беларус было тое самае, што зрабіць вялікі чын Муцыя Сцэволы, альбо голым прайці па вуліцэ; і выгналі бы з гімназыі за такую крамолу, бо гэтта «істінарускі край», як сказау адзін інспэктар: «не в видах русскаго правительства распространяць малороссіанство».

У старым Менску былі тады характэрныя фігуры першых беларускіх прарокау. Гэта Кастравіцкі і стары археолог Татур, першы збірацель старыны беларускай, знауца гісторыі. Татур і яго прыяцель, дауно ужо памершы, граф Тышкевіч з Лагойска зьбіралі і штудзіравалі ішчэ у часы да Мурауеускія беларускую старыну. Кожны з іх меу музэі толькі беларускіх рэчэй.

Гэнрых Хрыстофоровіч Татур па дакумэнтам знау усіх людзей мінуушчыны нашай, усе эпохі. Ен шанавау і любіу усе старыя звычаі народныя, пакязывау, што яны ідуць ад сівай слаунай мінуушчыны беларускай, а ні «вредное суевѣріе».

Мы хлопцамі, разам с Кастравіцкім сядзелі у музэі Татура, сотні разоу расказывалі яму сваі «беларускія» пляны. Строгі старык, лысы, з рудой барадой, падобны да прарока Елісея, жыу з намі аднэй душой. Седзючы кружком у оумеркі у яго музэі заваленным кольчугамі, мечамі, старымі кнігамі, дакумэнтамі, мэбелью, абразамі, ен выслухівау нашы «даклады» аб нашых нісьмелых ішчэ спрэчках с палякамі і абрусіцелямі, давау рэзалюцыі: «разумна адказалі!» — «гэта пусты чалавек!..» Прыводзіу нам аргумэнты з гісторыі Беларусі.

Кастравіцкі быў духам «з беларускай пушчы» з народу; ад Татура веяло на нас духам Гедыміна, Ягайла, Констанціна Острожскаго, князеу Менскіх, Слуцкіх і усіх фундатароу і страіцеляу Беларускай мінуушчыны.

Гэта былі два магікана, дзьве крыніцы каторыя перэхавалі зародыш беларускай ідэі і ні далі ей загаснуць. Ад іх яна патроху разгаралася і асьвяціла цяпер усю Беларушчыну.

Ні забудзе вас Земля Беларуская!

Дух ваш будзе жыць з намі векі.

А. Уласоу.

Агульныя весткі.

Аддзяленне Ліфляндзіі і Эстляндзіі ад Вялікаросіі.

РЫГА 21 маю. Нямецкі урад заграничных спраў перадаў 19 мая расійскаму паслу у Бэрліне, Іоффе, ноту, у якой даводзіцца да ведама: Што Эстляндскі краёвы сойм у Рэўлі 9 красавіка, і Ліфляндскі у Рызе—19 красавіка, вынясьлі пастанову аб аддзяленні гэтых двух правінцыяў ад Расіі.

Такім чынам аддзяленне Балтыкі ад Вялікаросіі трэба лічыць споўніўшымся фактам.

(Rigaer Ztg. № 114).

ЛЮГАНО. «Cor. d. Sera» друкуе справаздачу аб палажэнні італьянскіх чугунак, на каторых пануе хаос. Прападаюць с таварамі ні толькі паадзінокія вагоны, але і цэлыя поезды. Вышэйшыя чыны занімаюцца прадажай пазваленняў на правоз тавароў. Былі прыпадкі умысных сустрэч

поездаў: каб укрыць нестачу пераслыланых тавароў. Газэта апаведае аб чысьленых напасьцях на поезды ў дарозі і друкуе пратэст жалезна-дарожнікаў, каторыя між іншым, т э- буюць, каб поезды хадзіл з жандармскай вартай.

БЭРЛІН (В.Т.Б.) 23-V. «Nordd. Allg. Ztg.» піша:

Эканамічная умова між Нямеччынай і Швэйцарыей падпісана ўчора с тым, што яе павінны пацьвярдзіць абодва ўрады. З вялікім здаволеннем можам адзначыць, што, ні гледзючы на чысленыя перашкоды і патайную работу ворагаў, удалося дайсьці удачнай развязкі, каторая нямецка-швэйцарскім эканамічным зносінам дае ізноў на доўгі час крэпкі фундамэнт. Умова гэта становіць рэзультат абапольнаго жадання абодвых народаў знайсьці аснову дзеля поўнай згодлівасьці ў найбольш важных дзеля абедзьвых старон справах.

БЭРЛІН (В.Т.Б.) 22-V. На сабранні тарговай палаты статс-сэкрэтар Кюльман прачытаў лекцыю аб румынскім міры. Між іншым, ён сказаў:

«Румынія с прычыны свайго нечувана шыбкаго эканамічнаго расьцвету была перад вайной у незвычайна добрым палажэнні. Пасьля няшчыраго і ў сваіх падробнасьцях варожаго да нас нэйтралітэту румынскі ўрад увёў свой свой народ у дрэнна прыгатаваную вайну, каб правясьці у жыццё ідэю імпэрыі Дацiя—балканскай вялікай дзержавы з 12-14 мільёнамі жыхароў. Мара нарысованая спрытнымі агентамі саюзьнікаў, пацягнула за сабой румынскія кіраўнічыя кругі, а народ пазволіў сябе ўцягнуць у вайну без ахвоты і жадання. Заблутанасьць пытанняў, зьвязаных з мірам, тлумачыцца тым, што гэта быў мір коаліцыі. Для Намеччыны аб захваце зямель ні магло быць гутаркі. Затое мы дайшлі значных эканамічных карысьцяў. Заплата, якую Румынія павінна даць пацярпеўшым нашым землякам, гэта—контрыбуцыя. Наша балканская палітыка будзе кіравацца да таго, каб умацавацца эканамічна па Балканах, каторыя зьвязываюць Эўропу с пярэдняй Азіей».

БЭРЛІН. У Ліфляндзіі і Эстляндзіі адчынены пачтовыя канторы у Балтыцкім Порце, Гапсалю, Лемсалю, Нарве, Пэрнове, Вэйзенштэйне, Вэрро і Вэзэнбэргу, дзе прынімаюць пісьмы і тэлеграмы з і ў Нямеччыну і гэнэрал-губэрнатарства Варшаўскае а такжа пісьмы з і ў Аўстрыю.

БЭРН. У Францыі шмат у якіх фабрыках амуніцыі узняліся забастоўкі дзеля пратэсту проці пасылкі мобілізованых работнікаў набораў 1910—1912 г. на фронт. Каб ні-дапусьціць задзержкі работы ў фабрыках, урад замяніў мобілізованых работнікаў амэрыканскімі салдатамі. З гэтай прычыны у Ліоне адбыліся сурьёзныя крывавыя стычкі.

БЭРН. С прычыны нiстачы бавоўны ў Англіі выдан прыказ, каб ад 18 чэрвеня чысло працуючых шпулек у фабрыках было памешшано на 50 %, а чысло гадзін работы—ад 55 да 40 гадзін у тыдзень. У прыказе разам с тым гаворыцца, што палажэнне—вельмі сурьёзнае і ў найбліжэйшым часе зробіцца ішчэ больш сурьёзным, калі дзеля падвозу бавоўны ні дадуць больш караблёў.

ВЕНА. У сталічным месці Карынтыі, Клягэнфурце, была устроена дэмонстрацыя проці палудзена-славянскай прапаганды. Прынята рэзолюцыя проці утварэння палудзена-славянскаго гасударства, якое загарадзіло бы вольную дарогу да Адрыятыцкаго мора, як для немцаў, так і для іншых народаў Аўстрыі.

КОНСТАНТЫНОПОЛЬ 22-V. Учора увечары імпэратар Кароль с жонкай выехалі назад. Султан праводзіў гасьцей на вакзал.

ВАШЫНГТОН. (Рэўтэр) 22-V. Прэзыдэнт Вільсон зацьвярдзіў закон, паводлуг каторага карацімуць за ўсе паступкі і словы проці верпасьці бацькаўшчыне.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Для выхаванцау сярэдніх кол м. Менску па ініцыатыве Старшыні Рады старэйшых Беларускаго клюбу Ф. Вернікоускаго, Цэнтральнаму Бацькоускаму Камітэту на многалюднай парадзе, 22 мая, у жаноцкай міністэрскай гімназіі, было прапановано карыстацца дарэмна кавалкам клюбнай зямлі на конным пляцу да $1\frac{1}{2}$ дзесяціны, дзеля уладжывання гульняу, кракету, качэлі і др.

Апрача гэтаго, маюць дастаць аркестр музыкі.

Прапанаванне, разумеіцца, прынято.

За гэту добрую ідэю Бацькоускі камітэт аднагалосна дзякавау Ф. Вернікоускаму, як неутамімаму працауніку на культурна-асьветных беларускіх справах.

Сярод выхаванцау вышэйшых і ніжэйшых пачатковых школ па ініцыатыве таго жа Ф. Вернікоускаго, увайшоушаго у кантакт с членамі думскай камісіі па народнай асьвеце Фрумкінай-Віхман, меюць быць так сама уладжэны гульні на другім клюбным вучастку на тым жа конным пляцу.

Р.-к. епіскап менскай епархіі Лозінскі прыезжае гэтымі днямі у Менск на часовае прабыванне дзеля агляду тутэйшых духоуных справ, пасьля чаго зноу выедзе у Пецярбург. Будзе ен так сама у Вільне і у Коуне.

Базавы пункт для расійскіх ваенна-палонных мае быць уладжаны у Менску у хуткім часе пры помачы думы, земства і расійскай арганізацыі «Центроплѣн», дзеля найхутчэйшай атпраукі палонных у Расію.

Афіцэрскім бюро заутра, 27 мая, будзе выдана пэнсія за май ад № 951 да № 1400.

Выезжаючым у Расію пэнсія выдаецца за дзень да выезду ні прытрымліваючыся ніякога распісання.

Юрыдычнае бюро і аддзел для дармовай Юрыдычнай помачы населенню і па сконцэнтраванню вестак аб стратах, учыненных жыхаром губэрні вайною, уладжываюцца губэрнскім земствам, на што асігновано 17,200 руб.

Страхавыя нормы ацэнак павялічаны губ. земствам у чатыры разы.

I гэта ні дзіва: увесь шмат каштоуны апарат земуправы апошнім часам толькі і інстнуе за рахунак страхавога капіталу.

У „Вэксэльштубе» (нямецкай меняльнай краме) за апошні час павялічуся прыток жадаючых абменяць расійскія (царскія і „керэнкі») грошы на рямецкія.

«Вэксэльштуб» адкрыты па даунейшаму дае за 1 р. царскіх—1 р. 25 нямецкімі (фэнінгамі).

У зьвязі с пауторнай рэгістрацыяй ад 25 мая афіцэрау і салдат, прахадіушых ваенную службу у мінуушую вайну, мажлівы праверкі на вуліцах і затрымліванне б. военно служачых (бездакумэнтнах) ад першых дзен, а ні пасьля 15 чэрвеня.

Вось дзеля гэтаго варта зараз жа рэгістравацца кожнаму с. б. ваенна-абавязковых афіцэрам—у афіцэрскім бюро, салдатам—у канцэляры паветоваго воінскаго начальніка.

Асобы ні з ваенно-абавязковых, а маючыя вядомую працу павінны, мець належаючыя сьвядецтвы, па мажлівасьці з нямецкім перэкладам за печацдю (арлом) камэндатуры, або нямецкаго градоначальства.

А барацьбе з безрабоціцай. Сягоння, 26 мая, аддбудзецца у менскай управе экстрэнная парада.

Лік безработных у нас у Менску, ні гледзычы на хуткую убыль насялення з-за ад'езду многіх у Расію і акупаваныя мейсцы, даходзіць да некалькі дзесяткау тысяч чалавек.

Агульная прыблізіцельная цыфра народонасялення — 140.000

Хлебны паек, нарэшці павялічываецца. С будучаго тыдня замест 2 ф. на порцыю—па $2\frac{1}{2}$ ф. пры чым па цане 60 кап. за фунт. У хуткім часе, як нам перадаюць, хлебны паек павялічыцца да 3 ф. на порцыі.

Новаадчынены Беларускі Народны Дом імені Максіма Богдановіча мае быць абаснованы замест Ляхоукі—на пляцу, дзе клюб „Беларускай Хаты». Гэта дзеля таго, каб глаунейшыя беларускія культурна-асьветныя установы былі сканцэнтрованы у адным мейсцы.

Катэдра Усходазнауства арганізавалася у Кенігсбэргскім унівэрсытэці, па даручэнню якой группа вучоных гэрманцау прэдпрынялі цяпер рад абследаванняу беларускаго краю, дзеля зьбірання матэрьялау і памяткау беларускаі старасьвеччыны.

Польскае прэдстауніцтво сілы збройнай, у Менску, ад учарайшаго дня дэмобілізовано і адозвано у Бабруйск па прыказу начальніка 1 Польскаго корпусу.

Расійскія падданыя, каторыя хочуць веыхаць у Расію і ні зьбіраюцца адтуль варочацца назад у Менск, маюць магчымасць, уперад да далейшых распараджэнняу, што дзенно у 4 ч. 40 м. пасьля поудня ад'еджаць з Аляксандраускаго вакза лу.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоунаг камандавання за 25 мая 1918 году.

ЗАХАД: Пры навольніцы і дожджу артылерыйска чыннасць была умяркаванай. Часамі у зьвязку з начнымі ата камі непрыяцеля поўночна—заходней Кэммэлю і поўночно і заходней Альберта прыймала большую сілу. Атакі непры яцеля паўсюдах пацярпелі віудачу. Каля Хамеля мы атк нулі непрыяцеля контр-атакай. Большай жа часьцю яго ата куючыя часьці адганяліся агнём перад нашымі акопамі. Ка манда наблюдацельнага самалёта: лейт. Эйзэнменгер і віце фэльфебель Гупд збілі 23 траўня із 6 ангельскіх аднамей сцовых самалётаў 4 штукі.

Першы-Гепэрал-кватэрмэйстар **фон-Людэндорф.**

Весткі с краю.

З Налібокскай валасьці.

Надто сухая пагода павысушвала усе балоты, але шкодзіць і пасевам. Жыто было-б добрае, дык сушыня ні дае падняцца—мала расьцець; ярыня кепская—сухо. Картофля усходзіць добра.

Сенажаць выглядае кепско і бярэць трывога, што сена сёлета можа ні быць.

Наагул, на сухіх грунтах ураджаю ні відаць, на цяжэйшых пасевы ішчэ трымаюцца.

Ф. Головач.

ВІЦЕБСК. Гэтта увесь час адбываюцца бежанскія сходы, на якіх выбіраюць пасланцоў да нямецкаго начальства, каб разам праканацца як і што стаіць у справе іх звароту дамоў. Пасланцы выбіраюцца па губэрням.

У губэрні каля дэмаркацыённай мяжы, па дробных мястэчках зьявіліся гурткі контрабандыстаў. Нідаўна адна такая компанія была злоўлена на расійскім баку каля мястэчка Бешанковічы і страціла усе свае тавары.

Селяне ніяк ні могуць прыстасавацца да «савецкай» улады. «Селяне прыходзяць у камітэт паслухаць, пішуць Вітэбскія «Извѣстія», аб чым у ім рахуюць і гамоняць. Але як усякі прыходзіць дзеля таго-ж самаго, то выходзіць, што «паслухаць» рады усе, а гаварыць аб якой нібудзь справе німа каму. Каб усё-ж такі справы неяк ішлі, то клічуць у рады «дзяльцоў», якія могуць і гаварыць і пісаць за грошы. Але ніякай працы, ад якой была-б карысьць, яны ні робяць».

СМАЛЕНСК. У зьвязку з дэкрэтам аб перадачы часьц царкоўных, касьцёльных школьных грошаў на карысьці хаўрусу калек-воінаў, падняласся проці-сэмітская агітацыя.

—Констытуцыя «Коммуны Западной Области» ужо выпрацована асобнай камісіяй з 9 чалавек. Подлуг яе Смаленскі «губисполком» касуецца. Аб другіх «исполкомах» пастановіць вышэйшая ўлада. Маюць быць складзены валастныя, павятовыя і іншыя «совѣты», як фундамэнт цэнтру «коммуны». Найменне «камісар» для савецкіх чыноўнікаў касуецца. Яны будуць называцца кіраўнічымі. Кіраўнічыя аддзелаў складаюць «Малый Совѣт Области», а разам з другімі адказнымі працоўнікамі аддзелаў — «Большой Совѣт» —Выканаўчы Камітэт які выбіраецца зьездам.

МАГІЛЕЎ. Уцекаючы, бальшэвікі узялі адгэтуль увесь ісьціннік Дзержаўнаго і прыватных банкаў на суму 30.000.000 рублёў. Працэнтныя паперы Дзержаўным і Шляхоцкім банкамі і казначэйствам вывезяны у Сімбірск.

Рэдактар **А. Прушынскі.**

Выдавецтво **Т-во «Заранка».**

Друкарня Я. А. Грынблята.